9. Логика: Учеб. пособие / В.Ф. Берков, В.И. Бартон, И.И. Дубинин и др.; Под общ. ред. проф. В.Ф. Беркова. – Мн.: Выш. шк., 1994. – 296 с.
10. Логика (логические аспекты общения): учебное пособие / В.Ф. Берков, Я.С. Яскевич, И.И. Дубинин. – М.: Наука, 1994. – 299 с.
11. Логика: Логические основы общения. Хрестоматия / Сост. В.Ф. Берков, Я.С. Яскевич, И.И. Дубинин. – М.: Наука, 1994. – 333 с.
12. Логика и риторика. Хрестоматия. / Сост. В.Ф. Берков, Я.С. Яскевич. – Минск: ТетраСистемс, 1997. – 624 с.
13. Берков, В.Ф. Логика. / В.Ф. Берков, Я.С. Яскевич, В.И. Павлюкевич. – Минск: ТетраСистемс, 1998. – 480 с.
14. Берков В.Ф. Логика: учебно-методический комплекс / В.Ф. Берков, С.В. Воробьева, И.И. Дубинин. – Минск: БГУ, 1999. – 59 с.
15. История логики: Учебное пособие для высших учебных заведений. / Под общ. ред. В.Ф. Беркова, Я.С. Яскевич. – Минск: РИВШ БГУ, 2000. – 148 с.
16. История логики: Учебное пособие / В.Ф. Берков, Я.С. Яскевич, С.В. Воробьева и др. – Мн.: Новое знание, 2001. – 170 с.: ил.
17. Легчилин, А.А. Развитие логики в Белоруссии / А.А. Легчилин, А.С. Клевченя // Современная логика: проблемы теории, истории и применения в науке. – СПб.: изд-во СПбГУ, 2000. – С. 491-496.
18. Легчилин, А.А. Развитие логики в Беларуси // Историко-логические исследования: сборник научных статей / под ред. А.Е. Конверского. – К.: Киевский университет, 2008. – С. 23-27.
19. Воробьева, С.В. Логика и коммуникация: пособие / С.В. Воробьева. – Минск: БГУ, 2010. – 327 с.
20. Воробьева, С.В. Логика: теория аргументации и критического мышления: учебно-методическое пособие / С.В. Воробьева. – Минск: БГУ, 2018. – 231 с.
21. Анталогія філасофскай думкі Беларусі : дапаможнік. У 3 т. Т 1 / склад.: А.А. Лягчылін [і інш.]; пад рэд. А.А. Лягчыліна, А.Ю. Дудчыка. – Мінск: БДУ, 2017. – 311 с.
22. Воробьева, С.В. Критическое мышление: взаимодействие логических, эпистемологических и когнитивных факторов / С.В. Воробьева // Философия и социальные науки. – 2015. – № 1. – С. 67-71.
23. Воробьева, С.В. Критическое мышление как моделирование личностной эпистемологии / С.В. Воробьева // Интеллектуальная культура Беларуси: управление знаниями в условиях социально-экономической модернизации: мат. Второй межд. науч. конф., Минск, 12-13 ноября 2015 / Ин-т философии НАН Беларуси. – Минск, 2016. – С. 117-120.
24. Щедровицкий, Г.П. Система педагогических исследований (методологический анализ) / Г.П.Щедровицкий // Логика и педагогика. – М., 1993. – С. 16–200.

**Голубева Людміла Леанідаўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт(Мінск, Беларусь)*

## ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ (XVI – XIX стст.)

Віленскі ўніверсітэт з’яўляецца найстарэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Ён быў заснаваны ў Вільні ў 1570 г. езуітамі як калегіум. У 1578 г. кароль Стэфан Баторый выдаў прывілей, зацверджаны 30 кастрычніка 1579 г. булай папы Грыгорыя XIII, згодна з якім калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію, што давала права прысвойваць вучоныя ступені, мець выбарную адміністрацыю, правы ўласнай юрысдыкцыі [7, с. 287 – 288]. Першым рэктарам акадэміі быў галоўны ідэолаг Контррэфармацыі Пётр Скарга (1536 – 1612) – рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, ініцыятар і прапагандзыст ідэй Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. [4, с. 53 – 54]. Па сваіх палітычных

поглядах ён быў прыхільнікам неабмежаванай манархіі. Абвінавачваў шляхту ў распаўсюджванні рэфармацыйных ідэй, крытыкаваў за злоўжыванне саслоўнымі прывілеямі і лічыў яе ніжэйшым саслоўем, здольным толькі на «ваеннае рамяство». На яго думку, свецкая ўлада павінна падпарадкоўвацца царкоўнай. а кароль – папу рымскаму. Ён адным з першых аб'ектыўна паказаў сацыяльную няроўнасць у дзяржаве і прадсказаў заняпад Рэчы Паспалітай.

П. Скарга заклікаў князя К. Астрожскага, а разам з ім і ўсе ўсходнеславянскія народы да царкоўнай уніі з Рымам. Ён прапанаваў шляхі пераадолення рэлігійнай варожасці, якія перашкаджалі аб'яднанню цэркваў, паказаў на тыя выгоды, якія атрымаюць праваслаўныя ад гэтага духоўнага саюзу з католікамі. Асветнік імкнуўся даказаць, што сапраўднае хрысціянскае веравызнанне ідзе ад рымска-каталіцкай царквы, якая мае законнае права быць галавой сярод усіх хрысціянскіх веравызнанняў. На яго думку, з прыняццем рэлігійнага саюзу, будуць створаны ўмовы для развіцця і росквіту сапраўднай навукі і належнай асветы для народа. Гэта прывядзе да знікнення адасобленасці і варожасці паміж праваслаўнымі і католікамі. Праваслаўная шляхта заслужыць большы давер і атрымае магчымасць займаць значныя дзяржаўныя пасады. Дзяржава, дзякуючы царкоўнай уніі, набудзе палітычную магутнасць [1, с. 386 – 387].

Акадэмія мела філасофскі і тэалагічны факультэты, рыхтавала выкладчыкаў для сярэдніх навучальных устаноў – калегіумаў, якія к канцу XVI ст існавалі практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі (у Полацку, Нясвіжы, Навагрудку, Мінску, Оршы, Магілёве, Брэсце, Гародні, Віцебску) і такім чынам садзейнічалі пашырэнню асветы на беларускіх землях, знаёмству беларускага грамадства з дасягненнямі заходнееўрапейскай навукі, падрыхтоўкі нацыянальнай інтэлігенцыі. Адначасова гэта спрыяла і ўмацаванню каталіцкай царквы, за што змагаўся і рэктар акадэміі П. Скарга.

У акадэміі выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу (фізіка, метафізіка, матэматыка, логіка, рыторыка, паэтыка, геаграфія), а таксама старажытныя (грэчаская, лацінская, яўрэйская) і новыя (нямецкая, французская) мовы. Студэнты тэалагічнага факультэта вывучалі свяшчэннае пісанне, тэалогію (палемічную, маральную, схаластычную), кананічнае права, казуістыку. У акадэміі на абодвух факультэтах вывучалася і беларуская мова. Віленская езуіцкая акадэмія з'явілася тэарэтычным цэнтрам Контррэфармацыі, змагалася супраць лютэранства, кальвінізму і антытрынітарызму (сацыніянства), якія былі распаўсюджаны на беларускіх землях у гг. Рэфармацыі. Па некаторых звестках з 1583 па 1781 гг. акадэмія прысвоіла сваім выпускнікам 4076 навуковых ступеняў, у тым ліку па праву – 149 [7, с. 287]. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў акадэміі Мялецій Сматрыцкі, Мацей Сарбеўскі, Сімяон Полацкі, Альберт Каяловіч, Аарон Алізароўскі.

Матэрыяльна Акадэмію падтрымлівалі каталіцкае духавенства, мясцовыя магнаты і шляхта: віленскія біскупы В. Пратасевіч, А. Валовіч, К. Бжастоўскі, суфраган М. Пац, кардынал Ю. Радзівіл, а таксама М. Радзівіл Сіротка. На сродкі мсціслаўскай кашталянкі Лізаветы Пузыны ў акадэміі была заснавана астранамічная абсерваторыя [7, с. 287 ].

У 1641 г. па ініцыятыве сына знакамітага асветніка XVI ст. Льва Сапегі (1557 – 1633) – падканцлера Вялікага Княства Літоўскага Казіміра Льва Сапегі (1609 – 1656) быў створаны ў складзе Віленскай езуіцкай акадэміі юрыдычны факультэт, які пачаў дзейнічаць у 1644 г. Казімір Леў Сапега ахвяраваў на ўтрыманне прафесароў юрыдычнага факультэта 12 500 польскіх злотых, перадаў акадэміі бібліятэку свайго бацькі, вядомую пад назвай «Bibliotecа Sapiehana», якая налічвала каля 3 000 назваў каштоўных кніг. У акадэміі выкладаліся курсы кананічнага і цывільнага права, таксама тым, хто праявіць сябе належным чынам падрыхтаванымі па гэтых навуках прысуджаліся навуковыя ступені, якія прысуджаліся ў другіх акадэміях і ўніверсітэтах [6, с. 126].

Па запрашэнню Казіміра Льва Сапегі ў Вільню прыбылі чатыры прафесары-правазнаўцы: з каталіцкага ўніверсітэта горада Інгольштата, што ў Баварыі два немцы – прафесар цывільнага права С. Дзільгер, прафесар кананічнага права І. Шаўэр, з каталіцкага ўніверсітэта горада Гранады прафесар цывільнага права Б. Соксо, і адзін беларус, ураджэнец Віцебшчыны, прафесар кананічнага права А. Алізароўскі (1610–1659), якога запрашэнне застала ў Падуанскім універсітэце. А. Алізароўскі папераменна ўзначальваў кафедры цывільнага і кананічнага права [6, с. 126]. У хуткім часе прыбыў шэраг іншых прафесараў. Першым дэканам юрыдычнага факультэта стаў прафесар С. Дзільгер.

А. Алізароўскі вядомы як правазнавец, палітолаг, сацыёлаг, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў свецкага кірунку ў палітыка-прававой думцы Беларусі XVII ст. ст.

Метадалагічны прынцып А. Алізароўскага – ісці за прыродай як лепшай правадыркай. Ёе стаяў на пазіцыі дваістай ісціны. Гэта выяўлялася пры трактоўцы сутнасці і прызначэння права. Ен нават не ўспамінаў пра вечнае права, якое паводле вучэння Фамы Аквінскага, лічылася законам вышэйшай боскай мудрасці і крыніцай усіх іншых відаў права.

Мысліцель прапанаваў наступную класіфікацыю права: боскае, натуральнае, права народаў. Пры гэтым боскае і натуральнае права знаходзяцца не ў падпарадкаванні другога першаму, а выступаюць як самастойныя віды і дапаўняюць адзін аднаго. А. Алізароўскі пазбягаў спецыяльнага аналізу ролі і прызначэння боскага права, а калі вымушаны быў да яго звяртацца, то даваў яму нетрадыцыйнае тлумачэнне: «Боскае права забараняе несправядлівасць, прыгнечанне бедных і ўсялякія крыўды» [1, с. 17–18]. Пераважна ён аналізаваў натуральнае права, якое прырода закладвае ў чалавеку як сацыяльнай і біялагічнай істоце. У сацыяльным аспекце прынцыпы натуральнага права выяўляюцца праз развіццё і ўдасканаленне сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей: сям’я, фальварак, паселішча, грамадства, дзяржава. З біялагічнай кропкі гледжання правы чалавека вызначаліся яго агульнасцю з жывельным светам і знаходзілі ўвасабленне ў праве самаабароны, праве распараджэння сабой, імкненні да супрацоўніцтва (зносін) з сабе падобнымі і інш.

У сваім вучэнні А. Алізароўскі адводзіць значнае месца, побач з прыродай, розуму і рацыянальным якасцям чалавека. Прырода і розум выступаюць у яго як зыходныя ўзаемадапаўняльныя перадумовы права.

Абгрунтаванне натуральна-прававых ідэй дазволіла яму развіваць новае буржуазнае разуменне свабоды і роўнасці.

На думку А. Алізароўскага існуюць тры віды свабоды: прававая, філасофская і палітычная. Прававая свабода– гэта здольнасць людзей у адпаведнасці з прыроднай і агульнай годнасцю распараджацца сваім жыццём паводле ўласнага разумення і патрабаванняў закону. Філасофская свабода – гэта ўлада розуму над эмоцыямі і імкненнямі. Палітычная свабода – гэта панаванне ў грамадстве права і закону, а не самавольства манарха [4; 6].

А. Алізароўскі распрацаваў канцэпцыю грамадскага дагавору, паводле якой прызначэнне і мэты дзяржавы звязваюцца з агульнаграмадзянскай карысцю і ўзаемазацікаўленасцю людзей у стварэнні палітычных саюзаў – супольнасцей. Передумовы гэтага складваюцца ў рэгуляванні адносін у сям'і, двары (сукупнасць некалькіх сем'яў) або панскім фальфарку, паселішчы, дзе ў рознай ступені фарміруюцца інстытуты ўлады бацькоў над дзецьмі, пана над падданымі і інш. [6]

Дзяржава, на думку асветніка – гэта створаны з мноства паселішчаў саюз і аб'яднанне-людзей, якія звязаны правам, што і ўвайшлі ў згоду ў імя добрага і шчаслівага жыцця. Праблемы дзяржавы ён цесна звязвае з пытаннямі грамадзянства. Паводле тагачаснай палітычнай ідэалогіі сапраўднымі грамадзянамі была толькі шляхта. А. Алізароўскі лічыў, што грамадзянамі дзяржавы з'яўляюцца ўсе жыхары, акрамя рабоў і іншаземцаў. У грамадстве існуюць вышэйшыя і ніжэйшыя саслоўі, але для кожнага павінен існаваць свабодны пераход з аднаго саслоўя ў другое, і грамадзяне ўсіх саслоўяў роўныя перад законам [4, с. 55–57].

Ігнараванне прынцыпаў грамадскага дагавору вядзе да гібелі дзяржавы. Разбуральнымі фактарамі з'ўляюцца дзеянні людзей, якія парушаюць чалавечыя сувязі, дрэннае кіраванне, адсутнасць законнасці і справядлівасці, няроўнасць, эгаізм пануючых саслоўяў, несправядлівае выкарыстанне права, асабліва ў судах.

Ён прытрымліваўся думкі, што дасканаласць дзяржавы залежыць ад найбольш рацыянальна выбранай формы кіравання. А. Алізароўскі з'яўляецца прыхільнікам спадчыннай манархіі, і ў той жа час ён быў праціўнікам тыраніі [4, с. 55–57]. На яго думку, у выключных выпадках у народа павінна існаваць права на паўстанне і забойства тырана. Мысліцель з абурэннем пісаў пра неабгрунтаванасць прысваення сабе панамі права на жыццё і смерць сялян.

У сувязі са спыненнем дзейнасці ордэна езуітаў у 1773 г. акадэмія перайшла пад апеку Адукацыйнай камісіі (першае ў Еўропе Міністэрства народнай адукацыі), якая пераўтварыла яе ў вышэйшую навучальную ўстанову новага тыпу (з 1781 г. акадэмія называлася Галоўнай школай Вялікага Княства Літоўскага) [7, с. 287–288]. Рэктарам Галоўнай школы быў прызначаны астраном Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728 – 1810), які, займаючы гэту пасаду каля 20 гадоў, правёў у Галоўнай школе рэформу і надаў адукацыі амаль свецкі характар. Як рэктар Галоўнай школы ВКЛ, ён прымаў удзел у дзейнасці Адукацыйнай камісіі ў Беларусі і Літве, у ажыццяўленні мер па ўдасканаленні навучальнага працэсу і выхавання

навучэнцаў; арганізаваў ва ўніверсітэце 2 аддзяленні – фізічнае і маральнае (факультэты логікі і права), адкрыў 4-гадовую школу падрыхтоўкі настаўнікаў. У 1773 г. распрацаваў праект заснавання ў Вільні спецыяльнага таварыства (Акадэміі Навук).

Куратарам Галоўнай школы стаў беларускі дзеяч Іахім Храптовіч (1729 – 1812), які таксама як і М. Пачобут-Адляніцкі быў стваральнікам і больш за 20 гадоў членам Адукацыйнай камісіі. Працаваў на пасадзе міністра замежных спраў. З'яўляўся канцлерам ВКЛ. У канцы XVIII ст. І. Храптовіч заснаваў у Варшаве «Таварыства сяброў навукі» [6, с. 126–128].

У сваім вучэнні мысліцель адзначаў аб наяўнасці ў грамадстве «натуральнага парадку», які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх членаў грамадства. Для падтрымкі такога парадку ў супольным жыцці заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым больш ён справядлівы. У цэнтры ўсяго знаходзіцца чалавек з яго патрэбамі, інтарэсамі, правамі і абавязкамі. Паколькі задавальненне патрэб чалавека магчыма толькі ў грамадсве, то кожны павінен лічыцца з патрэбамі іншых членаў грамадства. Але людзі значна адрозніваюцца адзін ад аднаго сваім маёмасным становішчам. Як вынікае з натуральнага парадку рэчаў, кожны павінен працаваць на тым месцы, якое яму натуральна наканавана, не імкнучыся пранікнуць у закрытую для яго сферу.

Прагрэсіўным момантам з'яўляецца тое, што маральны парадак ён ставіць у залежнасць ад фізічннага парадку прыроды. Маральныя законы, на яго думку, цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці [4].

І. Храптовіч, як і ўсе фізіякраты, грамадства разглядаў як натуральны арганізм, што складае частку прыроды, у якую ўваходзяць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі ж чалавек не мае свабоды ці бяспекі або пазбаўлены ўласнасці ён становіцца ізгоем, бескарысным для сябе і грамадства. І. Храптовіч лічыў чалавека і яго здольнасці (перш за ўсе разумовыя) галоўным элементам вытворчасці. Гаспадарчымі рэформамі і вызваленнем сялян ад прыгоннай залежнасці І. Храптовіч абгрунтаваў магчымасць узнаўлення грамадства. Ён верыў, што пры належнай арганізацыі грамадскага жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі «натуральнага права» ўзнікае магчымасць стварэння пастаянна растучай зябяспечанасці і асветы для ўсіх. Гэта быў асветніцкі гуманізм і адначасова утапізм. Гуманізм І. Храптовіча праяўляўся ў павазе да асобы селяніна, прызнанні яго натуральных правоў, ва ўвазе да творчасці народа [6].

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі Галоўная школа была падпарадкавана расійскаму ўраду і з 1796 г. пачала называцца Галоўнай Віленскай школай. У 1803 г. яна была рэарганізавана ў Віленскі ўніверсітэт. Ва ўніверсітэце было 4 факультэты: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычны, медыцынскі і факультэт літаратурных і вольных мастацтваў. Выкладалі ў ім 34 прафесары і 12 ад'юнктаў (памочнікі прафесараў). З 1803 па 1806 г. рэктарам універсітэта быў І. Страйноўскі (1752–1815), які ўзначальваў і Галоўную Віленскую школу [7, с. 287–288].

І. Страйноўскі ў 1780 г. быў прызначаны прафесарам кафедры натуральнага прва Галоўнай школы ВКЛ. Ён удзельнічаў у рабоце камісіі нацыянальнай адукацыі, уваходзіў у склад камісіі па падрыхтоўцы праектаў грамадзянскага і крымінальнага кодэксаў. Асветнік абараняў школу ад езуітаў, якія ў 1801 г. пры падтрымцы расійскага імперата Паўла І імкнуліся ўстанавіць кантроль над адукацыяй у Беларусі [7].

Вядомы ён і як арганізатар навуковых даследаванняў. Ён лічыў Бога творцам і першапрычынай прыроды. На яго думку назіранні за нябеснымі целамі, даследаванні рознага роду стварэнняў, развагі пра будову чалавека вымушаюць чалавечы розум прызнаваць існаванне вышэйшай сілы і мудрасці.

Асновай яго вучэння, як і ўсіх тагачасных фізіякратаў, было вучэнне пра натуральны парадак і як вынік яго – натуральнае права. Натуральны парадак рэчаў ён разглядаў як адзінства фізічнага і маральнага парадку, г. зн. як сукупнасць законаў прыроды і грамадства. Людзі, на яго думку могуць быць шчаслівыя толькі праз глыбокае пазнанне і поўнае захаванне гэтага натуральнага права. Адыход чалавека або грамадства ад дакладных і разумных законаў прыроды выклікае пакаранне – няшчасці, бедствы, беспарадкі і г.д. Натуральныя ж законы выяўляюць толькі натуральныя правы і абавязкі чалавека, да якіх належыць яго імкненне да самазахавання, задавальнення сваіх патрэб у ежы, адзенні, жыллі, прыладах працы. З натуральных правоў і абавязкаў асобнага індывіда ён выдзяляў сацыяльныя правы і абавязкі (вечныя і нязменныя правы асабістай свабоды, узаемнай дапамогі, прыватнай уласнасці). Ён лічыў, што здабытая сумленнай працай прыватная ўласнасць – краевугольны камень грамадства, а яе недатыкальнасць з’яўляецца найпершым натуральным правам чалавека [4].

Паводле І. Страйноўскага, ніхто не мае прва пазбавіць чалавека яго натуральнай свабоды. Ён павінен абараняць ад гвалту сваю ўласнасць і свабоду і, адпаведна, не рабіць замаху на чужую прыватную ўласнасць, не ўжываць сілы ў адносінах да іншых людзей, за выключэннем выпадкаў самаабароны. Прынцыпы натуральнага права ён разглядаў у якасці крытэрыяў «ісцінасці» або «няправільнасці» таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу.

Ён паслядоўна абгрунтаваў залежнасць шчасця народа і разумнае грамадскае ўпарадкаванне ад узроўню пашырэння ведаў аб прыродзе і грамадстве. Для ажыццяўлення плана асветы насельніцтва неабходна, на яго думку, стварыць правільную сістэму навучання юнацтва, усяляк садзейнічаць развіццю навукі, выдаваць кнігі, падручнікі [1; 4; 6].

З 1806 па 1815 гг. рэктарам ўніверсітэта быў Я. Снядэцкі, які вялікую ўвагу надаваў развіццю прыродазнаўчых навук [7].

Пры Віленскім універсітэце дзейнічалі медыцынскі, ветэрынарны, аграрнамічны інстытуты, добра абсталяваная астранамічная абсерваторыя, адзін з самых багатых у Еўропе батанічных садоў, 3 клінікі, аптэка, найбагацейшая бібліятэка. З 1805 г. універсітэт выдаваў штомесячны навукова-літаратурны часопіс «Dziennik Wilenski» («Віленскі дзённік») [7, с. 287–288]. Побач з прыродазнаўчымі, медыцынскімі і іншымі даследаваннямі ва ўніверсітэце вучоныя-грамадазнаўцы распрацоўвалі гістарычныя і гісторыка-прававыя праблемы, звязаныя з мінулым

Беларуска дзяржавы, пра што сведчаць працы І. Анацэвіча, М. Бабpоўскага, І. Даніловіча, І. Лялевеля, Т. Чацкага, Ю. Ярашэвіча. Універсітэт падтрымліваў навуковыя сувязі з Расійскай Акадэміяй навук, з Маскоўскім, Казанскім, Варшаўскім, Кракаўскім і іншымі ўніверсітэтамі. Ён з'яўляўся цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, якая была ўтворана ў 1803 г.. Адукацыя, атрыманая ў Віленскім універсітэце, не саступала той, якую давалі лепшыя тагачасныя ўніверсітэты Заходняй Еўропы. З яго сцен выйшлі такія вядомыя грамадскія дзеячы, паэты, пісьменнікі, навукоўцы, як А. Міцкевіч, Ю. Славацкі, Ю. Крашэўскі, І. Даніловіч, І. Дамейка, Т. Зан, Я. Чачот і інш. У апошнія гг. існавання Віленскага ўніверсітэта з 47 прафесараў 36 былі ўраджэнцы Беларусі і Літвы.

Віленскі ўніверсітэт з'яўляўся цэнтрам перадавой навуковай, грамадска-палітычнай і прававой думкі. У 1816 г. ва ўніверсітэце ўзнікла легальнае таварыства шубраўцаў, ядро якога складалі выкладчыкі ўніверсітэта. Таварыства выдавала штотыднёвую газету «Wiadomosci Brukowe» («Вулічныя навіны», рэдактар А Снядэцкі), на старонках якой выкрываўся рэлігійны фанатызм, адзначалася маральная дэградацыя шляхты, цяжкае становішча сялян [7].

У 1817 г. ва ўніверсітэце было ўтворана тайнае студэнцкае таварыства філаматаў (сяброў навукі), у якім аб'ядноўваліся галоўным чынам студэнты Віленскага ўніверсітэта. Сярод заснавальнікаў гэтага таварыства былі А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан. У дзейнасці таварыства адлюстроўваліся імкненні да сацыяльнага абнаўлення грамадства, пераадолення эканамічнай, сацыяльна-палітычнай і культурнай адсталасці. Філаматы ставілі задачу развіцця нацыянальнай самасвядомасці народа. Таварыства станоўча адносілася да ідэй рэвалюцыйных рухаў у Іспаніі, Італіі, Грэцыі, наогул усіх народаў, што вялі ў гэты час барацьбу за свабоду. Быць свабодным, лічылі філаматы – неад'емнае права кожнага чалавека і кожнага народа.

Філаматы падкрэслівалі сувязь палітыкі і маралі. Там, дзе дрэннае праўленне, не можа быць добрых грамадзян, а найлепшае праўленне там, дзе дабрабыт народа залежыць не ад волі аднаго, а ад намаганняў грамадскіх сіл. Выказваліся за неабходнасць Канстытуцыі і прадстаўнічага праўлення. У сваіх больш позніх праграмных установках філаматы падкрэслівалі неабходнасць сацыяльных перамен, вызвалення сялян ад прыгонніцкай залежнасці.

Асаблівасцю іх палітычных поглядаў было тое, што яны лічылі неабходным салідарнасць усіх слаёў грамадства ў барацьбе за незалежнасць. Сялянства па прычыне цемры і бескультур'я не можа актыўна ўдзельнічаць у вызваленчай барацьбе, а ўзначальваць жа яе, наогул, можа толькі шляхта. Як і мысліцелі эпохі Асветніцтва, філаматы шукалі прынцыпы стварэння справядлівага грамадства ў антыфеадальным, дэмакратычным тлумачэнні натуральнага права, з якога рабілі вывад аб свабодзе і роўнасці ўсіх людзей, іх карыснасці для грамадства. Погляды філаматаў, іх гуманістычныя ідэалы ў многім супадалі з поглядамі рускіх дваранскіх рэвалюцыянераў [2, с. 157–159].

У 1823 г. па справе таварыства пачалося следства. 20 удзельнікаў, у тым ліку А. Міцкевіч, Я. Чачот былі высланы непасрэдна ў Расію: у

Пецярбург і Маскву. Высветлілася, што існуюць таксама таварыствы філарэтаў (сяброў дабрачыннасці) і прамяністых.

Тайныя студэнцкія таварыствы прапаноўвалі праграмы ўдасканалення грамадства, звярталі ўвагу на неабходнасць палітычных і сацыяльных перамен, вялі планамерную, разлічаную на перспектыву працу па асветніцтву народных мас. У свядомасць мас яны ўносілі рэвалюцыйныя ідэі, рыхтаваліся да ўзброенай барацьбы з самаўладдзем, актыўна падтрымлівалі нацыянальна-вызваленчыя выступленні.

Дзякуючы існаванню тайных таварыстваў і прагрэсіўнай дзейнасці прафесараў сярод студэнтаў Віленскага ўніверсітэта распаўсюджваліся патрыятычныя, антыфеадальныя і антысамадзяржаўныя ідэі. У паўстанні 1830 – 1831 гг. прыняла ўдзел трэцяя частка студэнтаў, што і вызначыла лёс навучальнай установы. У 1832 г. расійскі імператар Мікалай I закрыў Віленскі ўніверсітэт. На яго базе былі створаны 2 акадэміі: Духоўная рымска-каталіцкая (была пераведзена ў Пецярбург) і Медыка-хірургічная (была пераведзена ў Кіеў). Віленскі ўніверсітэт аднавіў сваю дзейнасць у 1919 г. [7]

Такім чынам, Віленскі ўніверсітэт на працягу ўсяго свайго існавання з'яўляўся цэнтрам навукі, адукацыі, перадавой грамадска-палітычнай і прававой думкі. У яго сценах выкладчыкі і студэнты выказвалі прагрэсіўныя, адпавядаючыя рэчаіснасці ідэі, актыўна праводзіліся навуковыя даследаванні, друкаваліся працы навукоўцаў.

## Библияграфічныя спасылкі

1. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. Даведнік / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.

2. Белорусская юридическая энциклопедия : в 4 т. / редкол.: С.А. Балашенко (гл. ред.) [и др.]. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2007 – 2014. – 4 т.

3. Голубева, Л.Л. Виленский университет / Л.Л. Голубева // Белорус. юридич. энцикл.: в 4 т. – Минск, 2007. – Т. 1. – С. 208 – 210.

4. Голубева, Л.Л. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / Л.Л. Голубева. – Мінск : ГИУСТ БГУ, 2005. – 84 с.

5. Голубева, Л.Л. Іахім Літавор Храптовіч – дзяржаўны, грамадскі дзеяч, фізіякрат, маршалак Галоўнага Суда, міністар замежных спраў, апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага / Л.Л. Голубева // Юстиция Беларуси. – 2015. – № 1 (154). – С. 77 – 79.

6. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзёжнае навуковае супрацоўніцтва, 2002. – 248 с.

7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2001. – 2 т.

**Ивченков Виктор Иванович**
*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

# ДИСКУРСНЫЙ АНАЛИЗ СМИ В УНИВЕРСИТЕТСКОЙ НАУКЕ: ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИЙ ПОТЕНЦИАЛ И ЭФФЕКТИВНЫЕ ПРАКТИКИ

Формирование нового направления медиаисследований – дискурсного анализа СМИ – обусловлено развитием когнитивистики и укреплением онтологического статуса журналистики как сферы научного познания. Медиатекст аккумулирует в себе интегральное знание, представлен-